# ВЫСТАЎКА ДА ДНЯ ДРУКУ

7 мая ў дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна адкрываецца выстаўка, прысвечаная дню друку. У дыяграмах і малюнках будзе паказан рост перыядычнага большэвіцкага друку, рост кніжнай прадукцыі народаў Совецкага Саюза. Гістарычны аддзел адлюструе шлях большэвіцкага друку. Тут будуць першыя нумары большэвіцкай «Искры», «Правды», «Вперед», большэвіцкія лістоўкі, першыя менскія газеты — «Звязда» і інш. У асобным аддзеле наведвальнік убачыць газеты брацкіх компартый. Мяркуецца выставіць некалькі экземпляраў рэволюцыйных газет часу Парыжскай комуны. (БЕЛТА).